ставителями коррумпированного, подкупленного аппарата осуществили поворот общественного развития на 180 градусов. Это поворот осуществлен по сценарию западной политики благодаря предательству высших чинов партийного и государственного руководства.

## МОЎНАЯ ПРАБЛЕМА У БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ РЭФЕРЭНДУМУ.

**Кавалева Н.М.**

Па выніках рэферэндуму, які адбыўся 14 мая 1995 г., у нашай краіне сталі дзяржаўнымі дзве мовы - беларуская і руская. Але на жаль, многія дзяржаўные дзеячы і службовые асобы успрынялі гэты факт, як дазвол перайсці цалкам толькі на ужыванне адной - рускай мовы, хоць на самай справе іх задачай павінна было б быць забеспячэнне рэальнага раўнапраўя дзвюх моў.

Ва ўмовах нашай рэспублікі, дзе беларуская мова на працягу некалькіх стагоддзяў подвяргалася паланізацыі і русіфікацыі і амаль канчаткова была знішчана індустрыялізацыяй і калектывізацыяй, зруйнаваўшымі культурныя традыцыі беларускай вескі, рэальнае раўнапраўе дзвюх моў магчыма толькі на падставе забеспячэння прыярытэту беларускай мовы, найперш у сферы адукацыі.

Калі ставіць задачу свабоднага валодання выпускнікамі школы дзвюмя мовамі, то асноўнай мовай навучання павінна быць усе ж такі беларуская. Ёсць таксама сэнс аднавіць і абавязковы уступны экзамен па беларускай мове у ВНУ.

Такі падыход не проста дасць магчымасць падрастаючаму пакаленню далучыцца да нацыянальных каштоўнасцей краіны, што само па сабе ўзбагачае асобу, але і будзе садзейнічаць аб'яднанню нашага грамадства вакол нацыянальнай ідэі, як гэта ужо зрабілі нашы суседзі (украінцы, літоўцы і інш.)

Для выйсця з крызісу нам недастаткова добрых навуковаабгрунтаваных антыкрызісных праграм, ці замежнай дапамогі, нам - славянам - патрэбна ідэя, якая магла б садзейнічаць духоўнаму адраджэнню грамадства. Камуністычны ідэял даў нам сілу здзейсніць рэвалюцыю, індустрыялізацыю, перамагчы у вайне, але зараз ен страціў сваю прывабілівасць. Выхаванне патрыятызму магчыма зараз толькі на подставе нацыянальнай ідэі.

Нашы адступленні ад выканання закона "Аб мовах у рэспубліцы Беларусь" успрымаюцца ва усім свеце як адзін з крокаў на досыць выразна вызначыўшымся у апошні час антыдэмакратычным шляху развіцця нашага грамадства, што не прыбаўляе нам павагі з боку суседзяў.